23. Пьянкова, С. Народные песни Смоленской области (Методические рекомендации по работе с фольклорными коллективами) / С. Пьянкова. – Смоленск, 1988. – 120 с.
24. Пашина, О. Календарно-песенный цикл у восточных славян / О. Пашина. – М., 1998. – С. 85, 137, 178, 243.
25. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел, под редакцией Н. Тройницкого. – СПб., 1900.
26. Ромодин, А. О единстве северобелорусской музыкально-этнографической традиции / А. Родомин // Пашлю серу зязюльку па радзінушку / Сборник статей и рефератов Невельской международной гуманитарной конференции, посвященной 200-летию со дня рождения Яна Барщевского. – СПб. : Невель, 1996. – С. 44–46.
27. Ромодин, А. Человек творящий. Музыкант в традиционной культуре / А. Ромодин ; М-во культуры Российской Федерации, Российский ин-т истории искусств. – Санкт-Петербург : Российский ин-т истории искусств, 2009. – 279 с.
28. Смоленский музыкально-этнографический сборник. Том 1. Календарные обряды и песни / Рос. акад. музыки им. Гнесиных / редкол. : О. Пашина (отв. ред.). – Москва : Индрик, 2003. – 753 с.
29. Соболевский, А. Очерк русской диалектологии. II. Белорусское наречие / А. Соболевский. – Вып. III, год 2. – СПб., 1892.
30. Тавлай, Г. Белорусская компактная традиция на Херсонщине (анализ и практические выводы) / Г. Тавлай // Питання дослідження та збереження музичного фольклору Херсонщини. – СПб., 1991.– С. 93–97.
31. Тавлай, Г. Музыкальные фольклорные собрания О. Кольберга, Л. Кубы / Г. Тавлай // Белорусская этномузыкология: очерки истории (XIX-XX вв.). – Минск, 1997. – С. 63–66.
32. Тавлай, Г. О сходстве разноэтнических традиций и способах их трансляции (на материале календарных напевов белорусско-литовского пограничья) / Г. Тавлай // Механизм передачи фольклорной традиции. – СПб., 2004. – С. 39–49.
33. Таўлай, Г. Музыка Смаленшчыны ў даследаваннях Людвіка Кубы // Пашлю серу зязюльку па радзінушку / Г. Таўлай // Пашлю серу зязюльку па радзінушку / Сборник статей и рефератов Невельской международной гуманитарной конференции, посвященной 200-летию со дня рождения Яна Барщевского. – СПб. : Невель, 1996. – С. 68–71.
34. Традиционная музыка русского Поозерья : (По материалам экспедиций 1971–1992 гг.): Для пения (соло, анс., хор) и инструм. исполн. / сост. и коммент. Е. Разумовской; Рец. А. Некрылова, В. Лапин. – СПб. : Композитор, 1998. – 237 с.
35. Углік, І. Да праблемы этнакультурнай ідэнтыфікацыі / І. Углік // Пашлю серу зязюльку па радзінушку / Сборник статей и рефератов Невельской международной гуманитарной конференции, посвященной 200-летию со дня рождения Яна Барщевского. – СПб. : Невель, 1996. – С. 40–43.
36. Харьков, В. Русские народные песни Смоленской области / В. Харьков. – М. : Музфонд СССР, 1956. – 235 с.
37. Хрушчова, А. Працы У. Дабравольскага як крыніца вывучэння духоўнай спадчыны беларусаў Смаленшчыны / А. Хрушчова // Пашлю серу зязюльку па радзінушку / Сборник статей и рефератов Невельской международной гуманитарной конференции, посвященной 200-летию со дня рождения Яна Барщевского. – СПб. : Невель, 1996. – С.66–67.
38. Цьвікевіч, А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX вв. / А. Цьвікевіч. – Мінск, 1993. – 340 с.
39. Ширяев, Е. Беларусь : Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах / Е.Е.Ширяев. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 113 с.
40. Янчук, Н. К антропологии Малоруссов-Подлясян / Н. Янчук // Сборник в честь 70-летия Д. Анучина. – М., 1913. – С. 98.
41. Kolberg, O. Mazowsze : obraz etnograficzny. T. 5, Mazowsze stare. Mazury. Podlasie / O. Kolberg. – Kraków : W. L. Anczyc, 1890. – 380 s.
42. Kuba, L. Beloruská pisen. Slovanský sbornik / L. Kuba. – Praha,1887. – 124 s.
43. Olędzki, S. Polskie instrumenty ludowe / S. Olędzki. – Kraków : Polskie Wydawnictwo Muzyczne, 1978. – 113 s.
44. Sajewicz, M., Czyzewski, E. Zróżnicowanie słownictwa rolniczego w kilku gwarach wschodnio-słowianskich na polsko-białorusko-ukrainskim pograniczu językowym / M. Sajewicz, E. Czyzewski // Slavica Lubinescia et Olomucensia. – Lublin, 1970. – S. 87–95.
45. Vyžintas, A. Lietuvių tradiciniai instrumentiniai ansambliai / A. Vyžintas. – Klaipėda : Klaipėdos universiteto leidykla, 2006. – 168 p.



***Аляксандр Карацееў***


## ЗАСВАЕННЕ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ АЭРАФОНАЎ ЯК ПЕРСПЕКТЫЎНЫ НАПРАМАК ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКАНАЎЦАЎ-ІНСТРУМЕНТАЛІСТАЎ ДУХАВЫХ АНСАМБЛЯЎ І АРКЕСТРАЎ


*Аўтар артыкула разглядае значнасць народных духавых музычных інструментаў у кантэксце беларускай і сусветнай мастацкай культуры. На яго думку, гэтыя прылады павінны стаць не толькі аб'ектам грунтоўных навуковых штудый, але і актыўна папулярызавацца з мэтай ўключэння іх у сучасную выканальніцкую практыку як у сферы прафесійнай музыкі, так і ў аматарскай творчасці. Засваенне выканаўцамі на сучасных аркестравых і ансамблевых духавых і ўдарных інструментах дадаткова яшчэ і іх беларускіх аналагаў з'яўляецца, на думку аўтара, перспектыўным рэзервам і напрамкам развіцця як духавога мастацтва, так і нацыянальнай культуры цалкам.*



***Aleksander Koroteev***


## DEVELOPMENT OF BELARUSIAN TRADITIONAL AIRPHONES AS A PERSPECTIVE DIRECTION OF TRAINING OF INSTRUMENTALS FOR WIND BANDS AND ENSEMBLES


*In the article, the author examines the significance of folk wind and percussion musical instruments in the context of Belarusian and world art culture. According to the author, these instruments should not only be the object of thorough scientific research, but also actively popularized with the aim of including them in performing practice both in the field of professional musical performance and loving folk art. Mastering on modern orchestral and ensemble wind and percussion instruments, in addition, the Belarusian national folk wind and percussion instruments is, according to the author, a promising reserve and direction for the development of wind art and the national culture as a whole.*


Гісторыя з'яўлення і эвалюцыі народнага духавога музычнага інструментарыя налічвае ўжо больш за 80 000 гг. [27] і, дзякуючы яго вырабу, рэканструкцыі, мадыфікацыі, ён працягвае радаваць прыхільнікаў традыцыйнай культуры і музыкі. Сёння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народныя аэрафоны прысутнічаюць у выканальніцкай практыцы і з'яўляюцца арганічным кампанентам актуальнай структуры мастацтва. Народныя духавыя і ўдарныя інструменты беларусаў, на жаль, пакуль яшчэ не сталі моцна запатрабаванымі аб'ектамі навуковых даследаванняў нацыянальнай і сусветнай этнаарганалогіі ў глабальным кантэксце. Адна з нашых публікацый і была прысвечана менавіта гэтай праблеме [14, с. 65–75].

У сусветнай гісторыі народныя аэрафоны і адпаведныя ім выканальніцкія практыкі ў розных формах – solo, ансамбль, капэла, аркестр, – займаюць су'ёзнае месца і выклікаюць цікавасць як у саміх выканаўцаў музыкі вуснай традыцыі, так і ў спецыялістаў галіны музыкі пісьмовай, акадэмізаванай (выкладчыкаў, аранжыроўшчыкаў, кампазітараў, музыказнаўцаў). Гэтай унікальнай з'яве прысвечаны не толькі асобныя артыкулы, але і манаграфіі [19–22; 26]. Пытанні гісторыі, эвалюцыі народных аэрафонаў, іх функцыянавання і значнасці ў жыцці грамадства прысвечаны шэраг прац [7, с. 8–20; 8, с. 219–221; 16, с. 296–320; 19, с. 66–72; 22; 23; 26, с. 533–590]. Засваенне і выканальніцтва на народных духавых і ўдарных інструментах, у тым ліку і беларускіх, –працэс даволі працаёмкі [13, с. 200–205; 14, с. 65–75; 17, с. 109–123]. Найважнейшы аспект працэсу засваення народнага музычнага інструментарыя – яго папулярызацыя, асабліва сярод моладзі. Гэтую праблему мы разглядалі асобна [18, с. 87–94].




Малюнак 1 – Фота У. Грома на лагатыпе фестываля выканаўцаў на народных аэрафонах. Крупіцы, 2018



Малюнак 2 – Рэктарат БДУКМ на справаздачным канцэрце ўніверсітэта з удзелам капэлы У. Грома «Гуды», у цэнтры – Я. Грыгаровіч. Мінск, 2005



Малюнак 3 – Ансамбль драўляных труб на адкрыцці канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор», кіраўнік – аўтар (2-гі справа). Мінск, 2016

З 1980-х гг. назіраецца актыўнае засваенне беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў асобнымі выканаўцамі ў складзе аматарскіх і прафесійных калектываў. У 2000-х гг. пачаўся і мэтанакіраваны навучальны працэс ва БДУКМ па падрыхтоўцы адпаведных выканаўцаў на дудцы, акарыне, жалейцы, дудзе, а таксама саломцы, драўлянай пастуховай трубе, рогу, ударных. У кантэксце асвятлення гэтага прэцэдэнта варта ўзгадаць постаць прафесара У. Грома (мал. 1) і яго характарыстыку ад тагачаснага рэктара БДУКМ Я. Грыгаровіч (мал. 2): «Бывае, што Бог надзяляе аднаго чалавека мноствам талентаў. Дык вось, спадар Гром – гэта музыкант, аранжыроўшчык, апрацоўшчык, даследчык народнай песні, этнограф, выдатны педагог. Яго прыход ва ўніверсітэт асвяціў шлях нашага ВНУ новай этналагічнай плынню. Калі мы сем гадоў таму ўпершыню набіралі студэнтаў на спецыяльнасць "народныя духавыя інструменты", многія ўсміхаліся, не верылі ў поспех нашай справы. Маўляў, што можа паказаць Гром у тым сонме музычнай інструментальнай культуры, якая ўжо ёсць? Уладзімір Мікалаевіч надзелены вялікай місіяй вярнуць нашаму народу памяць, што была некалі рассеяна ў сумятні доўгіх гадоў. І той ціхі і ў той жа час узрушаны спеў, і вельмі далікатны беларускі танец, і цудоўнае гучанне народных інструментаў. Няхай дасць Грому Бог вялікай сілы і далей выконваць сваю місію!» [25]. Праблемы дадзенага навучальнага працэсу былі разгледжаны намі ў шэрагу публікацый [10, с. 138–146; 11, с. 364–372; 12, с. 18–21; 15, с. 165–166]. Улічваючы накіраванасць на падрыхтоўку спецыялістаў з кваліфікацыяй «Канцэртны выканаўца. Выкладчык. Артыст аркестра. Артыст камернага ансамбля», на кафедры духавой музыкі з'явілася магчымасць навучання ігры на народных духавых і ўдарных таксама і студэнтаў па паралельнай спецыяльнасці: 1-18 01 01 «Народная творчасць» напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 02 «Інструментальная музыка духавая». Для спецыялістаў па адзначаным напрамку намі была распрацавана вучэбная праграма дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент», якая з'яўляецца арганічнай часткай усяго навучальнага працэсу [2].

Дзякуючы гэтай праграме і выкладчыкам, студэнты дадаткова да сваёй падрыхтоўкі засвойваюць такія беларускія народныя духавыя, як сапранавая дудка, акарыны, жалейкі, дуда, драўляная пастуховая труба (мал. 3). Улічваючы тое, што пасля заканчэння БДУКМ студэнты будуць працаваць у сферы акадэмічнага духавога мастацтва, ім мэтазгодна засвоіць навыкі выканаўства на беларускіх народных духавых. А дысцыпліна «Дадатковы народны інструмент» павінна спрыяць фарміраванню навыкаў выканальніцтва на народных духавых паводле лепшых узораў традыцыйнай музыкі. Дзякуючы зместу дысцыпліны, навучанне на беларускіх духавых спрыяе развіццю самастойнасці мастацка-вобразнага мыслення, развіццю творчай індывідуальнасці будучага спецыяліста галіны духавога мастацтва, здольнага выконваць не толькі камерна-інструментальныя, ансамблевыя ці аркестравыя творы на сваім базавым інструменце (флейта, кларнет, саксафон, труба, валторна, трамбон і інш.), але і на традыцыйным (дудка, дуда, акарына, драўляная труба і інш.). Спалучэнне навыкаў акадэмічнай музыкі і манеры традыцыйнага выканальніцтва дае творчыя вынікі і забяспечвае маладым інструменталістам універсальны выканаўчы і педагагічны вопыт.

Адзначым, што вывучэнне спецыялістамі сферы духавога мастацтва дысцыпліны «Дадатковы народны духавы інструмент» дазваляе ім вырашыць шырокае кола задач па асабістай теарэтычнай і творча-выканальніцкай падрыхтоўцы: 1) атрымаць грунтоўныя веды у сферы духавога музычнага мастацтва па ўсіх існуючых выканальніцкіх формах: сольнае, ансамблевае, капэльнае і аркестравае выканальніцтва; 2) развіць адпаведныя асабістыя творча-выканальніцкія навыкі з мэтай іх выкарыстання ў будучай прафесійнай самастойнай дзейнасці па развіцці выканальніцкіх традыцый на розных традыцыйных народных духавых інструментах і духавога ансамблевага, аркестравага выканальніцтва ўвогуле; 3) арыентыравацца у выбары неабходных творча-выканальніцкіх рашэнняў у класічных творах, творах сучасных кампазітараў, у тым ліку і эксперыментальна-стылізаваных, па дамоўленасці з выкладчыкам для вывучаемага народнага духавога інструмента падчас падрыхтоўкі акадэмічнай праграмы для іспытаў (кантрольны ўрок, сесіённы іспыт)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці з кіраўніком вучэбнага калектыва для канцэртных выступленняў у складзе ансамбля, аркестра; 4) усвядоміць для сябе сутнасць папулярнасці і выразных мастацкіх асаблівасцей выканальніцтва на народным духавым інструменце. Засваенне студэнтамі сутнасці асноў выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах прадугледжвае параўнальны аналіз і сувязь з музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі «Сальфеджыё і тэорыя музыкі (гармонія, паліфонія, аналіз музычных форм)»; дысцыплінамі спецыялізацыі «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Нацыянальная і сусветная гісторыя выканаўства на духавых інструментах», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка работы з аркестрам (ансамблем), «Інструментазнаўства і інструментоўка»; творча-практычнымі дысцыплінамі спецыялізацыі «Аркестравы класс», «Інструментальны ансамбль і інш. Мэтай адзначанай вучэбнай дысцыпліны павінна стаць падрыхтоўка кваліфікаваных выканаўцаў на беларускіх народных духавых музычных інструментах. У выніку асваення матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны духавы інструмент» падчас асабістай працоўнай прафесійнай дзейнасці выпускнікі змогуць займацца самастойнай творча-выканальніцай дзейнасцю на тым ці іншым беларускім народным духавым музычным інструменце ў сферы аматарскай творчасці ці, нават, у сферы прафесійнага музычнага мастацтва (сольнага, ансамблевага, капельнага, аркестравага).

Падчас засваення тэарэтычнага і практычнага вучэбнага матэрыяла студенты павінны вырашыць наступныя задачы: 1) атрымаць неабходныя веды ў народна-інструментальным кірунку музычнага мастацтва; 2) развіць адпаведныя творча-выканальніцкія навыкі ў асабістай мастацка-прафесійнай дзейнасці; 3) састаўляць планы самастойнай работы па засваенні асноў выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах, уключаючы інструктыўны матэрыял – практыкаванні, гамы, эцюды, мастацкі матэрыял – камерна-інструментальныя творы, партыі ансамблевых ці аркестравых твораў, сольныя партыі ў суправаджэнні аркестра духавых і ударных інструментаў; 4) самастойна вызначаць ансамблевыя ці аркестравыя цяжкасці і ажыццявіць адпаведную работу па іх дакладнаму выкананню; 5) дакладна ажыццяўляць настройку таго ці іншага музычнага інструмента з дапамогай цюнара ці фартэпіяна; 6) ажыццяўляць пошукі найбольш эфектыўных канцэртных увасабленняў народнай традыцыйнай музыкі і сучасных аўтарскіх твораў народна-інструментальнага мастацтва; 7) спрыяць сацыякультурнаму прэстыжу народна-інструметальнай спадчыны Беларусі і развіццю айчынных народных традыцый.

За перыяд вывучэння дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» студэнты набываюць веды, якія забяспечаць ім навыкі выканання на свістковых, язычковых ці амбушурных беларускіх народных духавых інструментах (класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных беларускіх народных духавых інструментаў, сутнасць і змест этапаў сольнага выканаўства ў суправаджэнні фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў, магчыма, і эстраднага ансамбля ці аркестра). Таму студэнты ведаюць: тыпалогію, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных народных, народных духавых лабіяльных, язычковых (іх класіфікацыя па сусветнай сістэме Закса-Харнбостэля з улікам сучасных змен; мастацка-выканальніцкія і выразна-тэхнічныя магчымасці; строй; натацыя; дыяпазон і г.д.); спецыфіку сольнага выканаўства (solo; solo ў суправаджэнні фартэпіяна; solo ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля, народнага аркестра ці духавога аркестра); псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты засваення духавых інструментаў у адпаведнасці з атрыманнем кваліфікацыі «Выкладчык»; віды і неабходныя этапы работы над музычнымі творамі (папярэдняя аналітычная работа па вывучэнні вызначанага для працы матэрыяла; музычна-выканальніцкі аналіз вывучаемых твораў; змест адпаведнага графіка па вывучэнні найбольш складаных фрагментаў выконваемых твораў; асноўныя этапы і іх паслядоўнасць; прынцыпы работы над асабістым творам ці іх камбінацыямі); выкананне варыянтаў, трактовак, інтэрпрытацый, рэдакцый, музычных твораў (параўнальны аналіз музычнага матэрыяла з улікам вывучэння арыгінала твора ці яго адаптацыі – нотныя выданні, відэазапісы і г.д.); эфекты мастацка-выразных магчымасцей духавых лабіяльных, язычковых і амбушурных інструментаў (solo, кантрапункт, музычная арнаментыка, сучасныя прыёмы ігры і г.д.); асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на духавых лабіяльных, язычковых і амбушурных інструментах і іх сацыякультурная значнасць.

Удасканальваючы выканальніцкія навыкі на сваіх базавых аркестравых духавых або ўдарных музычных інструментах, студэнты павінны развіць наступныя ўменні: арганізаваць неабходныя самастойныя ранішнія заняткі з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату; самастойна настройваць свой інструмент і ажыццяўляць неабходныя карэктуры пры недакладным інтанаванні, збалансаванне дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні фартэпіяна ці ў складзе ансамбля, аркестра духавых і ударных інструментаў; вызначыць абавязковыя папярэднія заняткі з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату да выканання заданняў; дакладна выконваць абертоны; рабіць неабходныя карэктуры пры недакладным інтанаванні; складаць планы па арганізацыі самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды, творы); складаць планы самастойнай работы над музычнымі творамі па індывідуальнай падрыхтоўцы; вызначаць ансаблевыя ці аркестравыя цяжкасці і планаваць неабходную работу па іх дакладным выкананні; валодаць тэхналогіяй асноўных штрыхоў, прыёмаў, манеры гучання, элементамі выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах і арыентавацца ў вызначэнні спецыфікі пабудовы і адпаведнага выканання фразіроўкі ў залежнасці ад жанравай накіраванасці твораў; расшыфроўваць і дакладна выконваць метра-рытмічную структуру музычнай арнаментыкі (трэлі, групета, мардэнты і г.д.).

Падчас вывучэння дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» студэнты авалодваюць выкананнем на шэрагу народных духавых: храматычнай дудцы (сапрана і*n C*); магчыма і на шэрагу дадатковых духавых – акарыне, храматычнай жалейцы, дудзе (*in D*, *in G*), драўлянай трубе і інш. Падрыхтоўка заданняў падчас аўдыторных, а таксама і самастойных заняткаў на беларускіх народных духавых свістковых, язычковых і амбушурных інструментах прадугледжвае штосеместравую атэстацыю па выкананні сольных вучэбных праграм (*solo, solo* ў суправаджэнні фартэпіяна, выкананне партый ансамблевых і аркестравых твораў).

Адзнака вучэбных дасягненняў студэнта мае паэтапны характар, фарміруецца ў адпаведнасці з канкрэтнымі заданнямі па вучэбнай дысцыпліне і праводзіцца па дзясяцібальнай шкале адзнак і крытэрыях, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь [24, с. 19–20].

Магчымасць валодання не толькі сваім духавым аркестравым інструментам, але яшчэ і традыцыйным духавым інструментам дазволіць такім музыкам стаць мультыінструменталістам і выступаць альбо ў фальклорных калектывах, альбо ў якасці саліста ў суправадженні духавога аркестра. Такія прыклады ў сучаснай выканальніцкай практыцы ўжо ёсць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, засваенне выканаўцамі на сучасных аркестравых і ансамблевых духавых і ўдарных інструментах дадаткова яшчэ і беларускіх нацыянальных народных духавых і ўдарных інструментах з'яўляецца перспектыўным рэзервам і кірункам развіцця як духавога мастацтва, так і нацыянальнай культуры ў цэлым.

**Спіс літаратуры:**


1. Ансамблевае выканаўства: вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 16 01 06 11 – Духавыя інструменты (народныя) [Рэк-на ў якасці тып.]. Склад. : А. Карацееў, А. Караткевіч, І. Мангушаў. – Мінск : БДУ культуры, 2003. – 22 с.
2. Дадатковы народны інструмент: вучэбная праграма для ВНУ па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая. Склад. : А. Карацееў. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 21 с.
3. Гром, У. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. Гром, А. Крамко, І. Мангушаў. – Мінск : БДУКМ, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
4. Гром, У. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. Гром, А. Крамко, И. Мангушаў. – Мінск : БДУКМ, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
5. Гром, У. Заіграйце, музыкі! : рэпертуар. зб. для фалькл. калектываў : у 2 ч. / У. Гром. – Мінск : Чатыры чверці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.
6. Гром, У. Дударэньку-гаспадэньку : рэпертуар. зб. для аматараў ігры на дудзе / У. Гром ; Бел ІПК – Мінск, 1999. – 54 с.
7. Имханицкий, М. Сколь народны народные инструменты / М. Имханицкий // Народныя музычныя інструменты ў мастацкай культуры XX ст. : Зборнік навук. арт. / рэд. Н. Яканюк і інш. – Мінск : БУК, 1999. – С. 8–20.
8. Коротеев, А. Белорусские народные духовые музыкальные инструменты как эффективные трансляторы традиционной культуры (рубеж XX–XXI вв.) / А. Коротеев // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 26–28.04.2013) / БДУКМ; рэдкал. : В. Языковіч і інш. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 219–221.
9. Коротеев, А. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Коротеев // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : мат-лы чытанняў (Мінск, 24–26.05.1998) : у 2 ч. / ЕГУ; БУК / рэд. А. Пазнякоў і інш. – Мінск : БУК, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.
10. Коротеев, А. Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: Материалы научных конференций "Беларусь и музыкальное наследие XX ст. : поиски и обретения» (29–30.11.2001, Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10–11.12.2002, Минск). – Вып. 1. – Минск : БГАМ, 2004. – С. 138–146.
11. Коротеев, А. Духовое искусство Беларуси: системно-комплексный анализ и перспективные пути профессиональной подготовки исполнителей на оркестровых и народных духовых инструментах специалистов высшей квалификации по заочной форме обучения / А. Коротеев // Исторические и психолого-педагогические науки: научные труды Республиканского института высшей школы. сборник научных статей: В 2 ч. / под ред. В. Беркова. – Минск : РИВШ, 2012. – Вып. 12. – Ч. 2. – С. 364–372. – Библиогр. : с. 371–372 (13 назв.).
12. Коротеев, А. Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе : материалы Респ. науч.-практ. конф., Мозырь, 12–13.02.2004 : в 3 ч. – Мозырь : МГПУ, 2004. – Ч. 1. – С. 18–21.
13. Коротеев, А. Исполнительство на традиционных народных духовых инструментах как структурный компонент национальной художественной культуры (в контексте искусствоведческого исследования духового искусства Беларуси) / А. Коротеев // Культура. Наука.Творчество. VI Междунар. науч.-практ. конф. / Минск, 10–11.05.2012: сб.науч. ст. / Мин-во культуры Республики Беларусь; гос. ун-т культ. и искусств; науч. ред. М. Можейко. – Минск : БГУКИ, 2012. – С. 200–205.
14. Коротеев, А. Народные духовые инструменты белорусов как объекты научных исследований национальной и всемирной этноорганологии в контексте европейской культуры / А. Коротеев // Orkiestry dete w kulturze europejskiej: materialy z konferencji naukowej 20 –22.06.2015 Lobez. – Nr. 3; pod red. Bogdana Matlawskiego / Zwerciadlo etnologiczne rocznik katedry etnologii i antropologii kulturowej uniwersytetu Szczecinskiego. – Szczecin : Wydawnictwo naukowe uniwersytetu Szczecinskiego, 2016.– S. 65–75.
15. Коротеев, А. Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А. Коротеев // Высшая школа : проблемы и перспективы : материалы VI Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23–24.11.2004. – Минск : РИВШ, 2004. – С. 165–166.
16. Коротеев, А. Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Коротеев // Украïньска культура в іменах і дослідженнях : наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Рівне : Рівненський державний інститут культури, 1998. – Віп. 3. – С. 296–320.
17. Коротеев, А.Традиционные народные духовые инструменты белорусов как трансляторы достижений национальной художественной культуры / А. Коротеев // Folklor, folkloryzm, folk / pod red. Malgozaty Kowalik i Bogdana Matlawskiego. – Szczecin, 2016. – S. 109–123.
18. Коротеев, А. Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання): зб. навук. арт. / склад. і навук. рэд. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 87–94.
19. Коротеев, А. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24–26.05.2004) / рэдкал. М. Бяспалая і інш. – Мінск : БДУКМ, 2005. – С. 66–72.
20. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. ст. и материалов : в 2 ч. / сост. И. Мациевский ; под общ. ред. Е. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – 264 с.
21. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. ст. и материалов : в 2 ч. / сост. И. Мациевский ; под общ. ред. Е. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1988. – Ч. 2. – 327 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. Назина, И. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И. Назина ; под ред. М. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.
23. Назіна, І. Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.
24. Народна-ансамблевае выканальніцтва. Вучэбная праграма УВА па вуч. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя). Склад. : А. Карацееў. – Мінск : БДУКМ, 2018. – 27 с.
25. Шаноўны місіянер! // Беларусь сёння. – 2007. – 9 января. – № 22 659. – С. 12.
26. Hornbostel, E. Systematik der Musikinstrumente / Erich Moritz von Hornbostel, Curt Sachs // Zeitshrift fur Ethnologue. – 1914. – Bd. XLVI, 4–5. – S. 553–590.
27. Sachs, C. Handbuch der Musikinstrumentenkunde / Curt Sachs. – Leipzig : Auflage, 1930. – 420 p.

***Таццяна Бабіч***

## КОМПОЗИТОР И МУЗЫКАНТ ГОРАН БРЕГОВИЧ: РАСКРЫВАЯ ФЕНОМЕН АРТИСТИЗМА

*В центре статьи – Горан Брегович как одна из знаковых фигур в мировой музыке. Сегодня этот музыкант и композитор известен как автор саундтреков к фильмам режиссера Э. Кустурицы «Время цыган», «Аризонская мечта», «Андерграунд». Его песни исполняли Игги Поп и Сезария Эвора. В своем творчестве музыкант гармонично сочетает народную балканскую и цыганскую музыку с современными ритмами, тем самым определяя самобытность творческого стиля. В данной статье освещается деятельность этого музыканта и композитора, анализируются его концертные произведения и сочинения в области киномузыки.*

***Tatsiana Babich***

## COMPOSER AND MUSICIAN GORAN BREGOVICH: REVEALING THE PHENOMENON OF ARTISM

*Goran Bregovic is one of iconic figures in world music. Today, this musician and composer is known as the author of the soundtracks for the films directed by Emir Kusturica «Time of the Gypsies», «Arizona Dream», «Underground». His songs were performed by Iggy Pop and Cesaria Evora. In his work, the musician harmoniously combines folk Balkan and gypsy music with modern rhythms, thereby determining the originality of the creative style. This article highlights the activities of this musician and composer, analyzes his concert works and compositions in the field of film music.*

Есть личности, о которых можно говорить бесконечно, освещая разные грани их уникального творчества. К таким можно отнести сербского композитора и музыканта, автора знаменитых саундтреков к фильмам режиссера Э. Кустурицы Горана Бреговича. Критика называет его музыкантом-хулиганом, он блестяще играет на гитаре, а оркестром дирижирует, сидя к музыкантам спиной. Его образ вызывает недоумение и восторг одновременно: «весь в белом, в «золотых» туфлях на босу ногу и с мальтийским крестом вместо бабочки» [5]. Концерты Г. Бреговича похожи на сцены народной свадьбы, где царит всеобщее веселье и радость.

С детства Г. Брегович интересовался музыкой, при этом его музыкальное образование ограничилось лишь тем, чему его научили друзья. Еще будучи учащимся гимназии он играл в группе на бас-гитаре. С тех пор он решил связать себя с музыкой на всю жизнь. Настоящая популярность к Г. Бреговичу пришла, когда он работал в составе рок-группы «Bijelo Dugme» («Белая пуговица»), которая была создана в 1972 г. После распада Югославии группа прекратила и свое существование [3].

В 1994 г. Г. Брегович создает цыганский коллектив с экстравагантным названием «Свадебно-похоронный оркестр», который сегодня успешно выступает по всему миру. Музыкант работает в необычном формате: благодаря синтезу различных ритмов и колорита традиционной музыки разных народов (цыганской, балканской, болгарской, сербской), стилей поп-, фьюжн, джаза, музыка Г. Бреговича выходит за пределы определенного музыкального стиля и направления. В оркестре играют музыканты из разных регионов Балкан, Македонии и Южной Аравии. Возможно, из-за того, что они такие разные, вместе они звучат необычно. Музыкант считает, что музыка – это универсальный язык общения. В одном из интервью он подчеркнул: «Людей для своего оркестра я ищу со всего мира. Среди них есть невероятно образованные музыканты, но есть и те, кто и нотной грамоты не знает вовсе [4]. В состав оркестра входят музыканты Мукарем Реджепи (барабан, вокал), Бокан Станкович (труба), Драгич Величкович (труба), Стоян Димов (саксофон, кларнет), Милош Михайлович (баритон), Александар Райкович (баритон), а также вокалистки Даниела Радкова-Александрова и Людмила Радкова-Трайкова.

Особое место в творчестве Г. Бреговича занимает цыганский фольклор. Культура цыган очень колоритна, богата и разнообразна. Кроме того, считается, что русский шансон во многом обязан цыганскому романсу, переняв от него высокую драматичность, богатство образов и особенности исполнения. Если ты занимаешься музыкой, можешь считать себя цыганом», – говорит Г. Брегович. – Мне больно видеть, каким гонениям подвергаются цыгане во всей Европе. Их выселяют из Франции, Италии, Турции… Иногда мне кажется, что политики всего мира сговорились и пытаются доказать, что все проблемы человечества из-за цыган. Но это же не так: цыгане – это талант мира» [5]. В репертуаре оркестра Г. Бреговича есть трогательные цыганские романсы, среди которых – «Белая роза». На цыганском фестивале в Сремской Митровице была представлена опера А. Бреговича «Кармен со счастливым концом» (Karmen sa srećnim krajem).

Связь с фольклором – одна из особенностей творчества музыканта. Для ряда композиций Г. Бреговича характерно удивительное сочетание балканских мотивов с музыкой других народов, например, турецких ритмов. Для известной турецкой эстрадной певицы и актрисы Сезен Аксы композитор написал несколько ярких композиций. Примечательно, что здесь турецкая музыка сохраняет свою самобытность, легкость, мелодичность, глубину, чувственность и мягкость. В репертуаре Г. Бреговича есть и другая музыка – простая, чувственная, лирическая, с какой-то своей трогательной историей взаимоотношений и любви. Одна из самых завораживающих мелодий музыканта – танго «Табакера», слова к которому написала польская певица Кайя [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ